# ПАСЛАНЬНЕ ДА ФІЛІМОНА АПОСТАЛА ПАЎЛА

1 Павал, вязень Ісуса Хрыста, і Цімафей, брат, —
Філімону, улюбёнаму і супрацоўніку нашаму,
2 і ўлюбёнай Апфіі, і Архіпу, таварышу нашаму ў
барацьбе, і хатняй царкве тваёй:
3 ласка вам і супакой ад Бога Айца нашага і Госпада
Ісуса Хрыста.
4 Дзякую Богу майму, заўсёды ўзгадваючы пра цябе ў
малітвах маіх,
5 чуючы пра любоў тваю і веру, якую маеш да Госпада
Ісуса і да ўсіх сьвятых,
6 каб супольнасьць веры тваёй была дзейснай у
пазнаньні ўсякага дабра, якое ў вас у Хрысьце Ісусе.
7 Бо вялікую маем ласку і пацяшэньне ў любові тваёй,
бо праз цябе, браце, супачылі ўнутранасьці сьвятых.
8 Дзеля гэтага, маючы вялікую ў Хрысьце адвагу
загадваць табе, што прыстойна [рабіць],
9 лепш праз любоў прашу, ня хто іншы, як Павал,
староста, а цяпер і вязень Ісуса Хрыста.
10 Прашу цябе адносна дзіцяці майго Анісіма, якога я
нарадзіў у путах маіх,
11 што быў некалі некарысны для цябе, а цяпер
патрэбны табе і мне.
12 Яго я паслаў, а ты яго, як маё нутро, прыймі.
13 Хацеў я яго пры сабе трымаць, каб ён замест цябе
паслужыў мне ў путах за Эвангельле,
14 але без твае згоды нічога не хацеў зрабіць, каб дабро
тваё не з прынукі было, а з добрае волі.

15 Бо можа ён дзеля таго на гадзіну адыйшоў, каб ты
атрымаў яго назаўсёды,
16 ужо не як слугу, але вышэй за слугу, як брата
ўлюбёнага, асабліва для мяне, а тым больш для цябе
— і паводле цела, і ў Госпадзе.
17 Дык калі маеш мяне за супольніка, прыймі яго, як
мяне.
18 А калі ён чым скрыўдзіў цябе або вінен, лічы гэтае
на мне.
19 Я, Павал, напісаў маёю рукою: «Я аддам»; каб не
казаць табе, што ты і самім сабою мне вінны.
20 Гэтак, браце, дай мне скарыстацца ад цябе ў
Госпадзе; супакой маё нутро ў Госпадзе.
21 Пераканаины ў паслухмянасьці тваёй, я напісаў да
цябе, ведаючы, што ты зробіш і больш, чым кажу.
22 А таксама падрыхтуй для мяне гасподу, бо
спадзяюся, што праз малітвы вашыя буду вам
падараваны.
23 Вітае цябе Эпафрас, вязень разам са мною ў
Хрысьце Ісусе,
24 Марк, Арыстарх, Дэмас, Лука, супрацоўнікі мае.
25 Ласка Госпада нашага Ісуса Хрыста з духам вашым.
Амэн.

# Новы Запавет і Кнігі Старога Запавету
# Belarusian New Testament and Books of Old Testament

copyright © 2016 John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

Language: беларуская

Contributor: John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

Новы Запавет і Кнігі Старога Запавету
This translation is made available to you under the terms of the Creative Commons Attribution-No Derivatives license 4.0.
You may share, redistribute, or adapt this Bible translation or extracts from it in any format, provided that:

You include the above copyright and source information.

You do not use this work for commercial purposes.

Pictures included with Scriptures and other documents on this site are licensed just for use with those Scriptures and documents. For other uses, please contact the respective copyright owners.

2021-05-20

---

PDF generated using Haiola and XeLaTeX on 11 Nov 2022 from source files dated 29 Jan 2022
64be8e54-78c4-5277-8d28-9fc3e21a8e86